Б-172

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

Орган парткома і прафкома Бел. Дзярж. Універсітэта

№ 1(30) 1 студзеня 1937 г. № 1(30)

З НОВЫМ ГОДАМ, ТАВАРЫШЫ!

З НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНА—СТАЛІНА!

ВЫДАТНЫМІ АДЗНАКАМІ СУСТРЭНЕМ НОВЫ ГОД!

1937 год

У календары 1936 года сарван апошні лісток. Год застаўся пазадзі.

Год небывалых перамог на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

1936 год быў небывалым годам у гісторыі чалавецтва. У гэтым годзе была прынята і зацверджана Сталінская Канстытуцыя. Па выражэнню таварыша Сталіна, « гэта будзе гістарычны дакумент, які трактуе проста і сцісла, амаль у гратакольным стылю аб фактах перамогі соцыялізма у СССР, аб фактах вызвалення працоўных СССР ад капіталістычнага рабства, аб фактах перамогі ў СССР разгорнутага да канца паслядоўнай дэмакратыі» (Сталін).

Сталінская Канстытуцыя ёсць самая дэмакратычная Канстытуцыя у свеце.

Варта спыніцца на пары лічбаў, каб наказаць, чым была краіна раней і што яна з сябе зараз прадстаўляе.

У 1913 годзе старая царская Расія ніколі не выпускала аўтамабіляў. За 11 месяцаў 1936 года заводы нашай краіны выпусцілі 161.500 аўтамабіляў. Царская Расія ніколі не вырабляла кішэнных гадзіннікаў, нават і марыць не магла аб такіх заводах, як «Точмеханіка», які мы пабудавалі за Сталінскія пяцігодкі. За 1936 год выпушчана 500.000 гадзіннікаў, 10.366.000 пар абутку вырабілі абутковыя фабрыкі Совецкай краіны, дабыта 1.714 тысяч тон рыбы і т. д.

Усё гэта гаворыць аб тым, што наша краіна стала магутнейшай, індустрыяльнай, соцыялістычнай дзяржавай.

Гэтых поспехаў мы дабіліся таму, што працуем пад кіраўніцтвам сталінскага ЦК ВКП(б) і вернага машыніста рэвалюцыі мудрага Сталіна, які вядзе нашу краіну ад перамогі да перамогі, які вядзе і прывядзе нашу краіну да пабудовы цудоўнага будынку, які будзе насіць імя комунізм.

Процілеглае мы маем у краінах капітала. Галеча, беспрацоўе, зніжэнне заработнай платы, гарматы і бомбы замест масла і хлеба — такая налітыка германскага фашызма, якая нясе рабочаму класу невыносныя мукі голаду, узмацненне эксплаатацыі і канцэнтрацыйных катаржных лагераў.

Азвярэлы фашызм ўсякімі метадамі прабуе напасці на нашу краіну, каб начаць новую крывавую бойню. Аб гэтым сведчыць цяперашняе міжнароднае становішча: пяцімесячная вайна у Іспаніі, вайна у Кітаі і інш. У канцэнтрацыйных лагерах катуюць лепшых сыноў народу, правадыроў рабочага класа, 4 гады у зняволенні — правадыр германскага пралетарыята, сакратар компартыі Германіі Эрнст Тэльман.

У іх — 60 мільёнаў беспрацоўных. Рабочыя выкідваюцца на вуліцу.

У нашай краіне ліквідавана беспрацоўе, ліквідавана эксплаатацыя чалавека чалавекам.

У нас — радаснае, шчаслівае жыццё.

Прайшоў слаўны 1936 год. Год нябачаных поспехаў і перамог.

1937 год для народаў Совецкага Саюза, узброеных Сталінскай Канстытуцыяй, будзе яшчэ больш радасны і шчаслівы.

ВЫШЭЙ СЦЯГ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб рабоце вышэйшых навучальных устаноў і аб кіраўніцтве вышэйшай школай» ускладае на студэнцкія грамадскія арганізацыі абавязак — карэнным чынам палепшыць арганізацыю соцспаборніцтва.

Найбольш цэннай дапамогай рэктарату ў рэалізацыі гэтай пастановы будзе з'яўляцца дзейсная работа па разгортванню соцспаборніцтва, асабістай ініцыятывы кожнага студэнта за павышэнне акадэмічных ведаў, культурнага і палітычнага ўзроўню, вартага спецыяліста нашай соцыялістычнай радзімы.

Ацэньваючы становішча соцспаборніцтва на БДУ трэба сказаць, што некаторыя факультэты паказваюць добрыя прыклады па разгортванню соцспаборніцтва (біяфак і гістфак). **Па гістарычнаму факультэту** (прафорг **Мельнічонак**) ўжо ёсць канкрэтныя факты, калі ў выніку заключаных соцдагавораў студэнты сталі лепш вучыцца, лепш работаць над сабой, больш удзельнічаць у грамадскім жыцці. Але часта грамадскія арганізацыі свядмі фармальнымі адносінамі да жывой справы ператвараюць соцспаборніцтва ў пустую паперку (геафак, фізмат). Так, на фізмаце (прафорг **Цукерман**) адсутнічае сістэматычная праверка ўзятых соцабавязкаў паміж студэнтамі і курсамі, не падводзяцца вынікі выканання самаабавязкаў, адсутнічае абмен вопытам работы выдатнікаў — перадавой, лепшай часткі студэнцтва, не выкарыстоўваюцца ўсе формы таварыскай дапамогі адстаючым.

Перш за ўсё пры заключэнні соцумоў паміж студэнтамі павінна быць яснасць у пытанні з якіх пунктаў складаецца прыкладнае соцыялістычнае абавязацельства. Абавязацельства павінна быць канкрэтным, даступным праверцы, павінна ахапіць галоўныя моманты ў рабоце студэнтаў, груп і факультэтаў.

Абавязацельства здаць нрахадзімыя дысцыпліны на «выдатна», углублённа, сістэматычна і ў тэрмін, прапрацаваць гэтыя прадметы, падрыхтаваць навуковы даклад, або даследчую тэму ў навуковым гуртку, выкарыстоўваючне дадатковай літаратуры пры прапрацоўцы курса, сістэматычная канкрэтная работа над павышэннем свайго палітычнага і культурнага ўзроўню, барацьба за свядомую вучэбную дысцыпліну — вось асноўныя абавязацельствы, якія павінны быць у соцдагаворы.

У студзені ў асноўным праходзіць здача экзамепаў за вучэбнае паўгоддзе. Выпікі гэтага паўгоддзя пакажуць нам як мы перабудавалі сваю работу адпаведна пастанове СНК і ЦК аб вышэйшай школе. Грамадскасць універсітэта павінна будзе па-дзелавому праверыць кожны індывідуальны соцдагавор, таксама паміж курсамі і факультэтамі, каб падводзячы выпікі дапамагчы рэлактару выявіць лепшых студэнтаў, лепшых навуковых работнікаў, лепшыя факультэты і курсы.

Сталінская Канстытуцыя абавязвае нас, совецкае студэнцтва, яшчэ больш патрабавальна адносіцца да якасці сваёй вучобы, палепшыць свае веды ў адпаведнасці з патрабаваннямі, прад'яўленымі совецкім спецыялістам.

Нашым адказам па прыняцце Сталінскай Канстытуцыі павінна быць — вучыцца на «выдатна», множыць рады выдатнікаў пры дапамозе соцспаборніцтва.

Л. І. КАМІНСКІ.
Старшыня профкома БДУ.

Сістэматычна кіраваць соцспаборніцтвам

На гістарычным факультэце БДУ, яшчэ ў пачатку навучальнага года былі заключаны соцыялістычныя дагаворы паміж паасобнымі студэнтамі на лепшую акадэмічную паспяховасць і актыўны ўдзел у грамадскай рабоце факультэта і універсітэта. Гэтыя індывідуальныя соцдагаворы з'явіліся велізарнейшым сродкам для паляпшэння настаноўкі акадэмічнай вучобы. Вось напрыклад, студэнт III курса таварыш **Чысцік**, які раней займаўся на «здавальняючы» і «добра», зараз ленінізм здаў на «выдатна». Як прафорг курса ён сур'ёзна адносіцца да выканання сваіх абавязкаў. Многа чытае мастацкай літаратуры.

Або возьмем студэнта II курса таварыша **Рыбакова**. Таварыш Рыбакоў гісторыю Усхода здаў на «выдатна». З'яўляецца добрым прапагандыстам. За першае навучальнае паугоддзе прачытаў больш 10 мастацкіх твораў класікаў рускай літаратуры. Можна прывесці і такі прыклад добрасумленнай работы студэнтаў. На соцдагавору III курс узяўся здаць ленінізм на «выдатна» 40 проц. студэнтаў, здалі на «выдатна» 40,7 проц.

Вельмі цікава і неабходна спыніцца на рабоце трыкутнікаў курсаў. Трыкутнік курса павінен штодзенна займацца пытаннем соцыялістычнага спаборніцтва. На вялікі жаль яны ў нас усё яшчэ працуюць недастаткова добра. Трыкутнік першага курса слаба правярае выкананне соцыялістычных дагавораў. Не вывучае сваіх людзей. Дрэнна цікавіцца бытам сваіх студэнтаў. Нашым трохкутнікам трэба неадкладна паставіць справу так, каб сістэматычна кіраваць соцспаборніцтвам і аказваць усямерную дапамогу студэнтам у рабоце.

МЕЛЬНІЧОНАК.
Прафорг гістфака.

Весела сустрэнем НОВЫ ГОД!

Для сустрэчы повага года прафком БДУ праводзіць рад цікавых мерапрыемстваў. Для дзяцей студэнтаў і дзяцей навуковых і тэхнічных работнікаў універсітэта рыхтуецца **новагодняя ёлка**, якая праводзіцца **30 XII-36 г. у 6 гадзін вечара.** Апрача гэтага многія студэнты і работнікі арганізоўваюць для сваіх дзяцей ёлкі на дому.

Для удзелу у правядзенні ёлкі запрошаны госці — піонеры і вучні 37 падшэфнай школы.

31-XII 1936 года вялікі вечар сустрэчы новага года. Вечар праводзіцца ў актавым зале БДУ. Запрошан канцэрт, з удзелам вядомых артыстаў **Громава, Міліна і інш.**

1 студзеня ў доме вучопых прафком праводзіць **вечар выдатнікаў БДУ.**

Так радасна мы сустракаем новы—1937 год у якім наша краіна, асветленая яркімі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі, дасць ещца яшчэ больш цудоўных перамог.

П. ЧАРНЯЎСКІ.

Прафком забыў аб культпаходах

Ужо прайшла палова навучальнага года, а мы не мелі ні аднаго культпахода ў тэатр.

Гэта зусім нецярпіма. Зараз ідзе цэлы шэраг класічных пастановак Пушкіна: «Яўгені Онегін», «Пікавая дама» і інш. Але прафком нічога не робіць, каб азнаёміць студэнтаў з гэтымі операмі і пастаноўкамі.

МІЦКЕВІЧ.

„Смотрите, завидуйте—я гражданин Советского Союза“ (Маяковский)

Буду біць без промаху ворагаў народу

Рэволюцыя застала мяне 8-гадовым хлапчуком. Мала чаго помню я аб старым жыцці, але з расказаў бацькі, іншых старыкоў і літаратуры ведаю, што жыццё было не лёгкім. Аб атрыманні асветы і марыць не варта было тады для працоўных.

У 1925 годзе я ўпершыню пазнаёміўся з школай і першай марай у мяне было скончыць вышэйшую навучальную ўстанову, хоць уяўленне аб ёй у мяне была вельмі туманнае. Цяпер мая мара збываецца.

Пасля доўгай падрыхтоўкі без адрыву ад вытворчасці я ў 1935 годзе паступіў ва універсітэт.

Першы год я закончыў паспяхова. Пры абмене партыйных дакументаў мне было дана указанне — вучыцца толькі на выдатна—і я гэта ўказанне выконваю. У гэтым навучальным годзе я здаў два прадметы на выдатна.

Совецкі Саюз з'яўляецца адзінай краінай у свеце, дзе дзверы школы шырока адчынены для усіх працоўных. Для нас, совецкай моладзі, прадастаўлены усе магчымасці паспяхова вучыцца.

Зусім інакш жывуць зарубежныя студэнты, і у прыватнасці фашысцкай Германіі, дзе вышэйшая школа падпадала разгрому сярэдневяковых варварау—фашыстаў. Выдатныя вучоныя, як Эйнштэйн, Франк і іншыя, вымушаны былі пакінуць Германію, бо цяпер ім там няма чаго рабіць. Фашысты замяняюць усе радасці жыцця маршыроўкай, сляпой дысцыплінай, рабскай пакорнасцю фабрыкантам і іх правадырам.

Нябачаны рост жыццёвага ўзроўню краіны соцыялізма дае магчымасць для усебаковага развіцця чалавека ў нашай краіне.

Знаходзячыся ў радах РСЧА я прайшоў школу снайпераў. Не мала знішчыў я «фашыстаў», «афіцэраў», «аэрапланаў» (макеты) на стралковых палігонах. Мая куля не ведала промаху, за што атрымаў ад Днепрапетроускага абкома КП(б)У прэмію. Ваенным камандаваннем занесен у гісторыю чацвертага артдывізіёна, як гэрой баявой падрыхтоўкі. Цяпер удзельнічаю у стралковай камандзе універсітэта.

Па першаму заклiку партыі і ўрада я гатоў заняць баявое палажэнне і меткім агнём буду знішчаць усякія «макеты», якія асмеляцца паяўляцца на граніцах нашай соцыялістычнай радзімы.

ШУЛЬМАН.
Выдатнік вучобы геафака.

ЗБЫЛОСЯ ТОЕ, АБ ЧЫМ І НЕ МАРЫУ

Годы цяпер не праходзяць, а пралятаюць. Мільгне ён з быстрынёй маланкі і няма. Не спраўіўся аглядзецца, а тут ужо і новы год. Здаецца зусім нядаўна, адзін дзесятак год назад, я працаваў яшчэ падросткам, «бронь», як нас тады называлі, на Магілеўскай станцыі ў вагонным цэху. А адзін-два гады перад гэтым бегаў абарваным хлапчуком па чыгуначных лініях.

Радасці не было граніц, калі я упершыню «сеў на свой хлеб». Працаваў з захапленнем, да ўсяго прыглядаўся і ўвесь час марыў стаць зусім самастойным чалавекам.

Як цяпер помню ні на адну мінуту не пакідала мяне думка: «хоць-бы хутчэй споўнілася 18 год. Стану качатарам..., а там... праз 6 месяцаў ужо змагу трымаць іспыты на памочніка машыніста. Папрацую добра, вывучу гэту магутную махіну і праз два з паловаю гады вытрымаю іспыты на машыніста. І потым... буду, як і мой бацька ездзіць..., сам паравозам кіраваць буду!..»

Так прадстаўлялася мне тады маё жыццё ў будучым. Аб большым я не мог і марыць.

Бацька мой, чыгуначны рабочы, расказваў мне, як яму цяжка было «выбіцца ў людзі».

— Нават вучыцца калісьці думаў — расказваў ён мне — але, дзе там... І ён пералічвае безліч мытарстваў неражытых ім для дасягнення сваей мэты — вучыцца.

— То «не благанадзейны», то «мужыкоў не прымаем», то яшчэ што небудзь выдумаюць, так і не ўдалося мне панасці у школу,—так, амаль заусёды заканчвау бацька свой расказ аб жыцці і пасля гэтага станавіўся хмуры, злосны на свае мінулае.

Наслухаўшыся такіх расказаў бацькі я і не думаў, што я калі небудзь атрымаю вышэйшую асвету...

Далей падзеі началі развівацца з быстрынёй маланкі.

У 1925 годзе я ўступіў ў комсамол, хутка мяне накіроўваюць на піонерскую работу. У 1927-29 годзе вучыўся на агульнаадукацыйных курсах. Затым 2 гады — Чырвоная Аямія, адкуль я вышаў камандзірам узвода. І прама з Чырвонай Арміі паступіў у Беларускі Дзяржаўны Універсітэт, на хімічны факультэт.

У 1933 годзе я скончыў Беларускі Дзяржаўны Універсітэт і паступіў у аспірантуру.

За тры гады вучобы ў аспірантуры я напісаў дзве самастойных, арыгінальных навукова-даследчых работы. Гэтыя работы ўжо надрукаваны.

У гэтым навучальным годзе я вяду самастойны курс па аналітычнай хіміі на біялагічным факультэце БДУ. Кірую практычнымі заняткамі студэнтаў хімфака, апрача гэтага кірую навукова-даследчым гуртком студэнтаў з 6 чалавек.

Апрача педагагічнай работы я цяпер працую вучоным сакратаром БДУ.

Не гледзячы на даволі значную нагрузку я не пакідаю і грамадскай работы ў комсамольскай арганізацыі. Чытаю многа навуковых кніг і мастацкай літаратуры, часта наведваю кіно і тэатр.

У 1937 годзе мяне чакае яшчэ адна вельмі важная падзея ў маім жыцці. У самым пачатку новага года я буду абараняць дысертацыю на ступень кандыдата хімічных навук. Дысертацыя ў мяне ўжо напісана і я буду імкнуцца абараніць яе на выдатна.

Не думаў я раней, што мне ўдасца атрымаць вышэйшую асвету, не кажучы ужо аб навуковай рабоце. Толькі дзякуючы Совецкай уладзе я змог стаць навуковым работнікам.

Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Советаў зацвердзіў Сталінскую Канстытуцыю. Гэта абавязвае працаваць нас яшчэ лепш на карысць нашай соцыялістычнай радзімы.

Мяне агортвае пачуццё нянавісці і агіды да «акадэмікаў невазвращэнцаў», аб якіх пісаў акадэмік Камароў. Я не магу сабе ўявіць, як гэта людзі могуць мяняць вольнае жыццё ў краіне соцыялізма на капіталістычнае рабства. «Мяне гаспадар не адпускае» — заяўляюць гэтыя акадэмікі. Як гэта дзіка і агідна гучыць для слуху совецкага грамадзяніна.

Няма і не можа быць лепшых умоў для развіцця навукі чым у нашай соцыялістычнай краіне, дзе вялікі Сталін, як кранатлівы садоўнік вырошчвае мільёны народных талентаў.

А. БУДКЕВІЧ,
навуковы работнік,
вучоны сакратар БДУ

Радасць сваю я не магу перадаць

Бацька мой быў плотнік, а маці—прачка. Абодва яны працавалі з рання да позняй ночы, ледзь нерабіваючыся на кавалак хлеба. Калі мне споўнілася 10 год, тобацькі аддалі вучыцца у кравецкую майстэрню, дзе я прабыла да 15 год падмайстрам, а потым мне сталі даручаць самастойную работу.

У майстэрні было большасць палякаў і мы пыталіся вучыцца грамаце на польскай мове, але гэта рабілася намі у вялікай тайне ад наліцыі, іначай усім нам пагражаў арышт.

Гэтыя моманты свайго дзяцінства ўспамінаю і параўнаю з тым, у якіх умовах знаходзяцца маё дзеці: ім Совецкая дзяржава забяспечвае бясплатнае навучанне, іх будучае таксама забяспечана ў нашай шчаслівай краіне. Маё дзеці не будуць ведаць падняволнай працы на нана-эксплаататара, яны растуць у акружэнні клапатлівай увагі нашай соцыялістычнай дзяржавы і стануць ноўнапраунымі грамадзянамі першай у свеце соцыялістычнай краіны рабочых і сялян.

Але не толькі за дзяцей сваіх я магу радавацца, мне самой толькі пролетарская рэволюцыя дала сапраўднае жыццё. Да рэволюцыі у мяне было цемнае, поўнае мукі існавання бяспраунай жанчыны.

Ныя совецкай уладзе я працую, адначасова і вучуся, чытаю кнігі і разумею тое, што раней для мяне было недаступным. З 1931 года я прымаю актыуны удзел у грамадскай рабоце, некалькі разоу абіралася членам мясцкома БДУ, а у 1934 г. мяне выбралі членам Гарадскога совета, дзе я удзельнічаю у работах секцый.

У якой краіне жанчына мае такія правы і магчымасці, якія маюць мільёны жанчын Совецкага Саюза. Нядауна зацверджаная Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездам Советаў Сталінская Канстытуцыя замацоўвае правы заваяваныя працоўнымі СССР.

І хочацца мне яшчэ раз сказаць, дзякуй наш родны любімы Сталін за радаснае, шчаслівае жыццё, якое ты даў нам.

СЕРАФІМОВІЧ,
Член горсовета, тэхпрацаўніца БДУ.

Перад намі адкрыты ўсе дарогі

Першыя свае словы я хачу прысвяціць таму, любоўю да каго перапоунены ўсе нашы сэрцы, любоу да каго трудна перадаць словамі — таварышу Сталіну. Я хачу сказаць дзякуй, тварцу новага жыцця нашаму дарагому Сталіну за шчаслівае, радаснае жыццё.

Сёння мне хочацца заявіць громка, ўсяму свету, аб сваёй гордасці. Я ганаруся тым, што жыву у краіне Совецаў, у краіне, якой варожа прыгнечанне чалавека чалавекам, якой варожа ўніжэнне чалавечага дастоінства, дзе галоўнай заботай, з'яўляецца забота аб радасці і шчасці кожнага грамадзяніна нашай краіны.

Мне не прышлося быць сведкаю царскага свавольства. Я не перажыла пачуццё знаёмае маиму бацьку, ды і ўсім жыўшым ранен, якія марылі вучыцца, але гэтыя мары заставалися толькі марамі, таму, што перад такімі як ен дзверы вышэйшых устаноу тады былі зачынены.

Я часта успамінаю расказы бацькі аб тым, як цяжка прышлося выбіцца яму на дарогу жыцця, дабіцца—кваліфікаванага рабочага, як ён кажа, «стаць чалавекам».

Калі я скончыла семігодку, мае бацькі спыталі: «кім ты хочаш быць?».

Я сказала—настаўніцай.

Так было і вырашана «сямейным советам», падаць дакументы ў педтэхнікум.

І так я стала студэнткай педтэхнікума.

Дасягненне сваёй мэты залежыць ад цябе, — сказаў мне бацька.

І вось настаў доўгачаканы дзень. Я помню, як у мяне замерла сэрца ад радасці, калі я ў першы раз прышла у школу і перада мною сядзела 3 дзесяткі дзяцей, выхаванне якіх было даручана мне.

Працуючы ў школе, я рашыла вучыцца далей.

Праз 4 гады, мая мэта збылася. У мінулым годзе мяне залічылі студэнткай БДУ.

Звярнуўшыся з іспытаў, я сказала, што буду займацца ў універсітэце.

— Вы, моладзь, шчаслівыя, — адказаў бацька. Вы жывеце у добры час, перад вамі адкрыты усе дарогі, а раней дочцы рабочага аб універсітэце і думаць не было чаго.

І вось ужо другі год, як я не толькі думаю аб вышэйшай асвеце, а ўжо аўладоўваю ведамі, для таго, каб быць карысным чалавекам нашай краіне.

У адказ на зацвярджэнне Сталінскай Канстытуцыі я абяцаю і ў 1937 г. здаць усе залікі на выдатна.

РАМАНЦОВА.
Выдатніца вучобы біяфака.

Выдатнікі вучобы БДУ: тт. СКАРАХОД, ПУЗЕВІЧ, КУР'ЯНАВА, ХАЙКІНА, КАМЯНЕЦКІ, КОШКІНА, ГАЛЕНКА.

ВЫВУЧАЕМ СТАЛІНСКУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ

НА КВАТЭРЫ ПРАФЕСАРА

Прафесары і навуковыя работнікі Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта сабраліся на кватэры свайго старэйшага таварыша — прафесара Владзіміра Кандрацьевіча **Дыдырка**, каб яшчэ раз абмяняцца думкамі аб дакладзе таварыша Сталіна і новай Канстытуцыі, каб пагаварыць аб канкрэтных мерапрыемствах па паляпшэнню работы да ўзроўню задач пастаўленых Сталінскай Канстытуцыяй.

Прысутнічаючы на гутарцы тав. **Ермоленка** — дэлегат Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў, падзяліўся сваімі ўражаннямі аб з'ездзе, аб сустрэчы з таварышом Сталіным і аб новай Канстытуцыі.

Потым выступалі прафесары **Пятосін, Снеткоў, Дыдырка,** дацэнты тт. **Пелеп, Шыдлоускі, Гельфанд** і іншыя. Усе выступаючыя выказвалі сваё захапленне поспехамі магутнага шматнацыянальнага народа пашай сацыялістычнай радзімы, якіх дабіліся мы ва ўпартай барацьбе з агентамі фашызма — трацкістамі, правымі капітулянтамі і іншымі ворагамі народа. У кожным выступленні з асаблівай сілай гучэлі словы ўдзячнасці вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну.

Асаблівая увага была звернута на абгаварэнне канкрэтных мерапрыемстваў па ўздыму работы, каб не быць у даўгу перад нашай сацыялістычнай радзімай, якая дае неабмежаваныя магчымасці для развіцця навукі.

Фізічная кафедра БДУ, па нрыкладу Усесаюзнай акадэміі навук, узяла на сябе абавязак абследваць выкладанне фізікі ў школах Менска і аднаго з раёнаў Беларусі і на аснове сабранага матэрыялу зрабіць аналіз становішча выкладання фізікі ў школе.

Амаль усе выступаючыя бралі на сябе канкрэтныя абавязкі па разгортванню навукова-даследчай работы, як самі, так і праз навукова-даследчыя гурткі студэнтаў. Прафесар **Ермоленка** паведаміў, што ён паспяхова прадаўжае работу над вырашэннем праблемы бракетыравання адсарбентаў (прэсавання паглынальнікаў), якая распрацоўваецца ў хімічнай навуцы ўпершыню.

Позна ўначы разыходзіліся прафесары з гэтай таварыскай гутаркі. Кожны з іх ішоў дамоў з рашучым намерам заутра працаваць лепш чым сёння, каб апраўдаць вялікія клопаты партыі і ўрада аб развіцці навукі ў нашай краіне, з пачуццямі шчырай удзячнасці таварышу Сталіну, за радаснае, шчаслівае жыццё у сучасным і яшчэ больш цудоўнае ў будучым.

Ф. К.

43 палітшколы

Усяго па БДУ арганізавана 4 партыйных школы. 18 комсамольскіх і 20 прафсаюзных школ, школа навуковых і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў.

43 пранагандыста кіруюць вывучэннем даклада таварыша Сталіна і матэрыялаў Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў. 10 гадзін адпушчана для вывучэння даклада таварыша Сталіна і Канстытуцыі.

Для прапагандыстаў была дана высокаякасная кансультацыя дацэнтамі-комуністамі тт. Сыцько і Ваўчком.

Студэнты, навукова-адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі БДУ глыбока вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю, змагаюцца за палепшанне якасці вучобы, за падрыхтоўку спецыялістаў, вартых эпохі вялікага Сталіна.

Праф. Ермоленка—ў падшэфным калгасе

19 снежня 1936 г. у калгас **«Кастрычніцкая рэволюцыя»**, Ратамскага сельсовета, выязджаў дэлегат Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў прафесар **Ермоленка** расказаць калгаснікам, як правядзіў сваю работу Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Саветаў.

Вестка аб прыездзе прафесара Ермоленка з надзвычайнай хуткасцю распаўсюдзілася не толькі па падшэфнаму калгасу, але і па ўсяму Ратамскаму с/совету. Яшчэ не пачало цямнець, як з усіх калгасаў Ратамскага с/совета на машынах і конях пачалі з'язджацца калгаснікі, каб наслухаць абранніка беларускага народа па Надзвычайным VIII З'ездзе Саветаў. Прафесар **Ермоленка** ў сваім дакладзе яскрава расказаў калгаснікам аб рабоце гістарычнага з'езда і аб дакладзе тварца новай Канстытуцыі — вялікага Сталіна.

Пасля даклада ў спрэчках выказалася многа калгаснікаў, якія аднадушна віталі Сталінскую Канстытуцыю, «пад сцягам якой мы будзем змагацца за высокі ўраджай калгасных палёў, за перамогу вышэйшай ступені сацыялізма — комунізма ў нашай краіне» — сказаў старшыня калгаса «Чырвоны араты». Пасля спрэчак калгаснікі выказалі вялікую падзяку дэлегату З'езда — прафесару **Ермоленка** і запэўнілі, што калгаснікі пагранічных калгасаў высокае званне грамадзяніна сацыялістычнай радзімы — апраўдаюць.

Т. ПАЗНЯКОЎ.

Навуковыя работнікі БДУ вывучаюць Канстытуцыю на кватэры прафесара ДЫДЫРКА В. К.

Мая любімая краіна

Жыццё красуецца, цвіце,
Пяе станок, пяе машына,
І я спяваць хачу табе,
Мая любімая краіна.

Ты, пад мудрым кіраўніцтвам
Партыі любімейшага сына
Красуеш ростам будаўніцтва
Мая любімая краіна.

У палях гамоняць трактары,
Іграюць весела турбіны, —
Музычны спеў стварыла ты,
Мая любімая краіна.

Сёння я магу пазнаць
Жыцця шырокія галіны, —
З цемры люд амагла ўзняць
Мая любімая краіна.

Юнацтва радасцю гарыць
Бадзёрыць кожную хвіліну
Шчасце ты змагла стварыць,
Мая любімая краіна.

Жыццё красуецца, цвіце
Пяе станок, пяе машына,
І я спяваць хачу табе,
Мая любімая краіна.

ІВ. КАЛІНІН.

Студэнт 1 курса Гістфака

Утрымаем чырвоны сцяг

Пачатак тэтага навучальнага года мы сустрэлі без дастатковай мабілізацыі ўвагі дэканата і кафедр да пастановы СНК і ЦК аб вышэйшай школе. Гэта прывяло да таго, што да гэтага часу вучэбны працэс не стабілізаван да канца ў духу новых патрабаванняў. Мы яшчэ не маем цвердага гадавога раскладу і толькі з 11 паўгоддзя будзе складзен сталы расклад да канца навучальнага года.

Перабудова вучэбнай работы была праробпена нахаду і ў гэтых адносінах мы маем дасягненні. Лекцыі чытаюць толькі прафесары і дацэнты, зацверджаныя ў гэтым званні, забяспечаны ўмовы для самастойнай работы студэнтаў шляхам выдзялення дзён, не нагружаных абавязковымі заняткамі (III і IV курс), адкрыт доступ у лабараторыі, адменены групавыя заняткі для «прапрацоўкі» вывучаемага матэрыяла, арганізаваны кансультацыі па розных дысцыплінах і адменена, існаваўшая раней, сістэма бягучага ўліку.

Усе гэта прывяло да значнага павышэння якасці самастойнай работы студэнта на малодшых курсах і да ўдзелу студэнтаў старэйшых курсаў у навукова-даследчай рабоце. Усяго на факультэце пры розных кафедрах у навукова-даследчых гуртках працуе 30 студэнтаў. Асабліва добра працуе гурток студэнтаў пры кафедры аналітычнай хіміі (загадчык кафедры праф. **Ермоленка**).

СНК СССР і ЦК ВКП(б) надаюць вялікае значэнне дысцыпліне у навучальных установах. Гэта у недастатковай ступені ўсвядомілі многія студэнты. На факультэце да гэтага часу ёсць сказненні і прагулы. Асабліва многа прагулялі без уважлівых прычын **Садоўская, Сацкевіч, Шамшурава, Столбава, Рошчына, Гайлік, Калініна, Філімонава** і іншыя. У адносінах, падняцця і ўмацавання дысцыпліны зроблена яшчэ недастаткова як з боку дэканата, так і з боку профсаюзных і іншых арганізацый.

Вялікім недахопам у нашай рабоце з'яўляюцца сумяшчэнні сярод супрацоўнікаў факультэта. Трэба адзначыць і дадатны факт, што аспоўныя дысцыпліны выкладчыкамі забяспечаны.

Не гледзячы на тое, што некаторыя навуковыя работнікі, як тт. **Ермоленка, Казлоў** і іншыя даюць навуковую прадукцыю, якая сведчыць аб глыбокай рабоце над сабой і выкладаемым прадметам, усё-ж, у галіне навукова-даследчай работы факультэт не стаіць на ўзроўні тых задач, якія пастаўлены рашэннем СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Для разгортвання навукова-даследчай работы створана неабходная матэрыяльная база. Толькі за апошні час Наркомасветы адпусціў 35 тысяч руб. на абсталяванне і пашырэнне навуковых лабараторый. Даны дзве навуковыя камандыроўкі у Маскву. Задача навуковых работнікаў скарыстаць усе магчымасці для разгортвання навукова-даследчай работы, і паставіць яе на належную вышыню.

Нельга абыйсці пытанне аб пісьменнасці. Пісьменнасць студэнтаў хімфака да апошняга часу застаецца далёка не задавальняючай. Таму дэканат арганізаваў на факультэце тры групы па вывучэнню беларускай мовы і тры групы для вывучэння рускай мовы. Заняткі ў кожнай групе праводзяцца сістэматычна адзін раз у тыдзень.

Хімфак, які атрымаў перахоцны Чырвоны сцяг у мінулым годзе, змагаецца за тое, каб утрымаць яго і ў гэтым навучальным годзе.

Прафесар НІКІФАРАЎ,
дэкан хімфака.

ГІСТОРЫЯ НЕ Ў ПАШАНЕ НА ГІСТФАНУ

Наша партыя і ўрад удзяляюць вельмі многа ўвагі гістарычнай навуцы. Аб гэтым яшчэ раз ярка гаворыць пастанова ЦК ВКП(б) і Соўнаркома СССР «аб выкладанні гісторыі у школах СССР», рашэнне ЦК ВКП(б) і заўвагі таварыша Сталіна, тт. Жданава і Кірава аб канспектах падручнікаў па гісторыі.

Усе гэтыя рашэнні партыі і ўрада вызначаюць канкрэтныя шляхі і патрабуюць рэзкага паляпшэння ўсёй вучэбнай работы вышэйшых навучальных установ.

Як-жа гістарычны факультэт БДУ выконвае гэтыя рашэнні?

На раду з амаль нармальнай работай I курса, на старэйшых курсах ёсць рад буйных прарываў у рабоце. Асабліва пагражаючым з'яўляецца становішча на III курсе, дзе павінны быць поўнасцю закончаны ўсе агульныя дысцыпліны.

Дэканат і навучальная частка ўніверсітэта не прынялі своечасова неабходных захадаў, каб забяспечыць факультэт высококваліфікаванымі выкладчыкамі. У выніку мы стаім перад фактам зрыву некаторых дысцыплін.

Дрэнна абстаіць справа з выкананнем навучальнага плана. Да 10 снежня, гэта значыць больш чым за тры месяцы, на III курсе займаліся толькі 287 гадзін, замест вызначаных па плану 396 гадзін. Толькі за гэты час недадана 109 гадзін, якія прыдзецца калі небудзь наганяць.

Гэта толькі колькасныя паказчыкі. Яшчэ горш абстаіць справа з якаснымі паказчыкамі выканання навучальнага плана. Чым былі запоўнены гэтыя гадзіны? З 287 гадзін, лекцыйных было ўсяго 129, з іх па гістарычных дысцыплінах толькі 75.

Расклад лекцый III і II курса перапоўнен мовамі — нямецкай, французскай, лацінскай, рускай. Усё гэта неабходна. Мовы трэба ведаць. Але гісторык павінен у першую чаргу ведаць гісторыю, а у нас, як кажуць, некаторыя студэнты, факультэт замежных моў з ваенна-фізкультурным ухілам.

Многія прадметы, якія пачалі чытаць яшчэ ў мінулым навучальным годзе, да гэтага часу не закончаны і ніхто не ведае калі іх пачнуць чытаць. (Гісторыя каланій, гісторыя партыі, гісторыя новага часу і інш.).

Некалькі слоў аб якасці выкладання гістарычных дысцыплін.

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК аб вышэйшай школе гаворыць аб тым, што лекцыя павінна быць асноўным у навучанні студэнтаў. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца студэнтам — вучыцца на выдатна, абавязваюць і выкладчыкаў — вучыць на выдатна.

На жаль, чытаемыя ў мінулым годзе на цяперашнім III курсе лекцыі стаялі на нізкім ідэйным узроўні. Напрыклад, «дацэнт» па гісторыі народаў СССР Пшанічны ў большасці выпадкаў прыходзіў на лекцыю непадрыхтаваным. На лекцыі ён адкрываў антымарксісцкі падручнік Піанткоўскага і чытаў слова ў слова з гэтага падручніка, нават не пераказваючы сваімі словамі. Гэты-ж «дацэнт» чытаў лекцыі аб Герцэне і Чарнышэўскім, трымаючы перад сабою журнал «История в средней школе» і паўтараючы слова ў слова артыкул Фралова ў гэтым журнале.

Дацэнт па гісторыі новага часу тав. Гольдберг большасць тэм чытаў (у літаральным сэнсе гэтага слова) па падручніку Рыкліна для сярэдняй школы, трымаючы перад сабою вырваныя старонкі з гэтага падручніка.

Дастаткова указаць, што ў ліку выкладчыкаў на III курсе няма ні аднаго прафесара.

Кафедры па гістарычным факультэце зусім не працуюць, а яны павінны былі быць вядучым звяном у барацьбе за якасць вучобы і разгортванне навукова-даследчай работы.

Барацьба за высокую якасць вучобы патрабуе узорнай пастаноўкі навукова-даследчай работы. Між тым і ў гэтай галіне гістарычны факультэт сільна адстае. Апрача аднаго арганізацыйнага сходу навукова-даследчага гуртка па гісторыі Рыма і Грэцыі нічога больш не зроблена.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што былое кіраўніцтва павучальнай часткі універсітэта, як і былы дэканат гістфака, не зрабілі ўсіх неабходных вывадаў з рашэння ЦК ВКП(б) і Соўнаркома аб вышэйшай школе, пусцілі важнейшую справу падрыхтоўкі кадраў на гістарычным факультэце на самацёк. Рэзультатам гэтага з'яўляюцца такія прарывы ў выкананні навучальнага плана на гістарычным факультэце, асабліва на III курсе.

Дэканат гістфака і вучэбная частка павінна замацаваць ужо маючыйся за апошні час зрух і у бліжэйшы час поўнасцю забяспечыць бесперабойную работу гістарычнага факультэта.

Л. Т.

ПЕРАПІС НАСЕЛЬНІЦТВА — УСЕНАРОДНАЯ СПРАВА

Правядзем перапіс на выдатна

Па ініцыятыве правадыра народаў вялікага Сталіна 6 студзеня 1937 года ў СССР будзе праведзен усесаюзны перапіс насельніцтва.

Гэта будзе трэці перапіс насельніцтва, які праводзіць совецкая ўлада за 19 год свайго існавання. Першы перапіс насельніцтва быў праведзен у 1920 годзе, другі — у 1926 годзе.

Надыходзячы перапіс насельніцтва з'яўляецца падзеяй найвялікшага значэння. Гэта будзе перапіс насельніцтва першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы. Ён будзе мець велізарнейшае палітычнае і народна-гаспадарчае значэнне для нашай краіны. У дакладных лічбах ён прадэманструе велізарнейшыя поспехі ў нашай краіне. Выключнае значэнне перапіс насельніцтва будзе мець і для далейшага планавання народнай гаспадаркі нашай радзімы ў трэцяй пяцігодцы.

За гады, аддзяляючыя нас ад апошняга перапісу насельніцтва, ў нашай краіне адбыліся велізарнейшыя змены. Выраслі новыя вялікія гарады з дзесяткамі і сотнямі тысяч жыхароў, выраслі тысячы буйных прадпрыемстваў. Совецкі Саюз з краіны адсталай і забітай ператварыўся ў перадавую культурную, індустрыяльную, соцыялістычную дзяржаву.

У выніку паляпшэння добрабыту працоўных мас Совецкага Саюза значна ўзрос фактычны прырост насельніцтва СССР, які ў апошнія гады складае каля трох мільёнаў чалавек у год.

Грамадскія арганізацыі БДУ вылучылі **200** студэнтаў для правядзення перапісу насельніцтва па гораду. Усе гэтыя таварышы ўсвядомілі сур'ёзнасць паручэння совецкага ўрада і ўзяліся за выкананне яго.

Вялікую і ганаровую ролю ў паспяховым правядзенні перапісу павінны адыграць прапагандысты і агітатары. Яны павінны растлумачыць усім студэнтам і работнікам БДУ ўсю важнасць правадзімага перапісу.

Перапіс насельніцтва праводзіцца на ініцыятыве вялікага Сталіна і ён павінен быць і будзе праведзен па-сталінску.

І. МЕЛЬНІК.

Як адказваць на запытанні шчотчыка

Пры правядзенні перапісу кожны грамадзянін павінен ведаць як даваць адказы на пытанні шчотчыка. Трэба дабіцца абсалютнай дакладнасці і правільнасці адказу ад усіх грамадзян.

Па пытанне «Колькі год або месяцаў ад роду?» — трэба дакладна указаць колькі год апытваемаму ўжо споўнілася.

На пытанне аб нацыянальнасці трэба ўказваць нацыянальнасць да якой прылічвае сябе сам апытваемы. Кожны грамадзянін СССР мае права рашыць да якой нацыі яго трэба аднесці, выходзячы з умоў, традыцый, культуры, у якіх выхоўваўся апытваемы. У радзе выпадкаў нацыянальнасць, натуральна, можа не супадаць з паходжаннем, так, грамадзянін, які жыве многа год у Беларусі, зрадніўся з беларускай культурай, чытае, піша звычайна па-беларуску, можа з поўным правам назваць сябе беларусом, хоць можа быць, ён па паходжанню і рускі. За дзяцей, якія самі яшчэ не могуць даць адказ на гэта пытанне, адказваюць іх бацькі. Яны рашаюць пытанне аб нацыянальнасці сваіх дзяцей і ў тым выпадку, калі бацькі розных нацыянальнасцей.

Пытанне аб роднай мове вызначаецца самастойна кожным грамадзянінам. Родная мова не павінна абавязкова супадаць з нацыянальнасцю. Вельмі часта людзі адной нацыянальнасці гавораць на мове іншай нацыянальнасці і лічаць яе роднай. У рускіх, напрыклад, роднай мовай можа аказацца беларуская, або украінская, у яўрэяў—руская, або беларуская і т. д.

Пятае пытанне перапіснога ліста аб рэлігіі — ставіцца для выяснення адносін кожнага грамадзяніна да рэлігіі ў сучасны момант. Дзяржаву зусім не цікавіць, які рэлігійны абрад быў зроблен над чалавекам у дзяцінстве. Не гэта павінна вызначаць яго рэлігійную прыналежнасць. Таму няверуючы павінен прама так і даць адказ — няверуючы. Калі чалавек веруе, то ён павінен указаць канкрэтна тую рэлігію, якую ён зараз існаведуе. Пытанне аб адносінах да рэлігіі, як і іншыя пытанні перапіснога ліста, не падлягаюць агалашэнню. Кожны грамадзянін можа быць упэўнен, што яго адказ застанецца тайнай. На пытанне аб адносінах да рэлігіі адказваюць толькі грамадзяне, якім споўнілася 16 год і больш.

Пры адказах на пытанне «Ці састаіць у шлюбе?» — трэба кіраванца тым, што перапіс улічвае ўсякі шлюб як зарэгістраваны, так і не зарэгістраваны. Аўдавеўшыя і разведзеныя павінны адказваць—**«Не»**.

Здаецца, што пытанне: «Ці граматны»—вельмі проста, аднак гэта пытанне выклікае многа няяснасцей. Калі чалавек умее чытаць, хоць-бы павольна і на адной хоць-бы якой-небудзь мове, яго трэба лічыць пісьменным.

На пытанне аб родзе заняткаў кожны грамадзянін павінен не абмяжоўвацца агульным адказам, напрыклад, «рабочы металіст» або «будаўнік», а ўказаць дакладна спецыяльнасць, напрыклад, слесар, наладчык, трактарыст, даярка і т. д.

Калі чалавек мае некалькі занятак, трэба запісаць, той які апрашваемы лічыць галоўным і т. д.

Перапіс павінен даць упаўне добраякасны матэрыял, які будзе скарыстан пры састаўленні плана трэцяй пяцігодкі, таму правільнасць адказаў — неабходная ўмова для паспяховага правядзення перапісу.

НОВЫ ІНТЭРНАТ ПАБУДОВАН

Закончана будаўніцтва новага інтэрната для студэнтаў БДУ. Новы 4-павярховы будынак мае 56 светлых прасторных пакояў. На кожным паверсе (за выключэннем першага) па два спецыяльных пакоі адведзена пад ленкутні, у якіх будуць шахматы, шашкі, більярд і іншыя ігры для студэнтаў.

Інтэрнат ужо электрыфікаван, у кожным пакоі ёсць радыё. Праведзен вэдаправод, каналізацыя і цэнтральнае ацяпленне.

На першым паверсе абсталёўваецца вялікі магазін, у падвальным памяшканні будзе пральня. Ёсць памяшканне для рамонтнай майстэрні абутку і вопраткі.

Усе асноўныя работы ўжо закончаны. Закуплена новае абсталяванне — добрыя краваці, матрацы, сталы і інш. Усё гэта цяпер устанаўліваецца.

У новы інтэрнат будуць пераведзены ў першую чаргу выдатнікі і лепшыя ўдарнікі універсітэта. Зараз працуе пры прафкоме спецыяльная камісія па адбору студэнтаў у новы інтэрнат. У студзені 1937 года студэнты будуць жыць у новым інтэрнаце.

Новы інтэрнат гэта яшчэ адзін «факт, а не абяцанне», як наша партыя і ўрад клапоцяцца аб развіцці навукі ў нашай краіне, аб паляпшэнні ўмоў жыцця студэнтаў і ўсіх грамадзян нашай радзімы.

Ф. КАН.

Памёр выдатны пісьменнік-большэвік Н. А. ОСТРОЎСКІ

Неўмалімая смерць пагасіла бясстрашнае, гарачае сэрца. Не стала выдатнага мастака слова, палкага барацьбіта, цудоўнага чалавека Нікалая Алексеевіча Остроўскага.

Народ нашай краіны ўтраціў аднаго з любімейшых сваіх пісьменнікаў, чые радкі і кожнае слова натхняюць на барацьбу і жыццё.

— Жыць і працаваць. Жыць і змагацца за лепшае, весці барацьбу з ворагамі, радавацца поспехам соцыялізма, тварыць і быць карысным краіне, — вось дэвіз і мэта гэтага цудоўнага чалавека.

«Шлёпнуць сябе кожны дурань зможа заўсёды і ва ўсякі час. Гэты самы труслівы і лёгкі выхад са становішча» — гаварыў Нікалай Остроўскі словамі Паўла Карчагіна ў рамане «Як гартавалася сталь».

«Самае дарагое ў чалавека — гэта жыццё, яно даецца адзін раз, і пражыць яго трэба, так, каб не было пакутліва балюча за без мэты пражытыя гады, каб не паліла ганьба за подленькае і дробезнае мінулае і, каб, паміраючы, змог сказаць: усё жыццё і усе сілы былі адданы самаму найпрыгожаму ў свеце—барацьбе за вызваленне чалавецтва».

І сапраўды, усё сваё жыццё Нікалай Алексеевіч аддаў «самаму найпрыгожаму ў свеце — барацьбе за вызваленне чалавецтва», барацьбе з ворагамі на франтах грамадзянскай вайны, на франтах соцыялістычнай будоўлі. І тады, калі бязлітасная хвароба назбавіла яго зроку, адняла ногі і рукі, калі жыццё зрабілася «невыносным» ён хацеў быць карысным краіне і нерамагаючы ўсе цяжкасці, невыносную боль узяўся за пяро. Н. А. Остроўскі стварыў вобразы, якія будуць вечна жыць і натхняць моладзь на барацьбу за справу партыі Леніна—Сталіна. Н. А. Остроўскі быў адважны сын свайго вялікага народу і сваей шчаслівай краіны. Цяжкая і доўгая хвароба не магла зламаць яго аптымізма, яго волі, яго бязмежную любоў да партыі, да радзімы і вялікую ненавісць да ворагаў.

Як толькі была атрымана вестка аб смерці пісьменніка ордэнаносца Н. А. Остроўскага ўсе студэнты БДУ сабраліся на жалобны мітынг. Усе выступаючыя са смуткам у сэрцы гаварылі аб вялікай утраце, якая пасцігла нас, гаварылі, што «для нас, совецкай моладзі, Нікалай Остроўскі—яркі прыклад волі і мужнасці, прыклад таго, як трэба змагацца за вялікую непераможную справу Леніна — Сталіна».

Уся краіна схіляе свае сцягі ў дзень смерці палкага чалавека, мужнага барацьбіта, таленавітага пісьменніка, героя — большэвіка.

Я. ПАЎЛОЎСКІ.

Маладыя кандыдаты матэматычных навук

27/XII—36 года, упершыню ў Беларускім Дзяржаўным Універсітэце, 2 навуковых работнікі БДУ — тт. **Лукомская** і **Мельнік**, у прысутнасці навуковых работнікаў БДУ, Акадэміі навук, Політэхнічнага інстытута і студэнцтва, абаранялі дысертацыі на ступень кандыдата матэматычных навук.

Тав. **Лукомская** ў сваёй рабоце прадоўжыла даследванні вядомага французскага матэматыка Адамара ў таліне вызначэння асобых точак аналітычных функцый і, апрача таго, паказала новыя метады знаходжання комплексных корняў [illegible]нняў. Работа тав. Лукомскай атрымала **дадатныя водзывы** вядомых матэматыкаў СССР праф. **Міхліна** і праф. **Чэбатарова.**

Таварыш **Мельнік** выканаў работу па даследванню размеркавання напружанняў у пругкай пласцінкі, якая ляжыць на пругкім аснаванні. Рашэнне пастаўленай задачы таварыш Мельнік выканаў **бліскучым і арыгінальным метадам.** Гэтае пытанне мае важнае значэнне для інжынернай практыкі і пры разліку пругкіх сіл у бальках. Работа таварыша Мельніка таксама атрымала **дадатныя водзывы** ад акадэміка **Бурстына** і праф. **Міхліна.**

Абарона дысертацыі паказала, што тт. **Лукомская і Мельнік грунтоўна і ўсебакова аўладалі матэрыялам сваіх работ.**

У заключных словах акадэмік **Бурстын** і праф. **Міхлін** падкрэслілі высокую якасць разгледжаных работ, пажадалі, каб абарона дысертацый, якая сведчыць аб росце нашых навуковых кадраў, стала-б частай з'явай у сценах БДУ.

НЕКРАШЭВІЧ.

ХРОНІКА

У пачатку студзеня 1937 г. адбудзецца **агульна-універсітэцкі палітдзень на тэму:** «Аб значэнні перапісу насельніцтва».

***

Да 15-гадовага юбілею універсітэта рыхтуецца **вялікая мастацка-аформленая фотагазета,** якая адлюструе вучобу, быт і культурны рост нашага студэнцтва.

Над афармленнем працуе брыгада з 10 студэнтаў пад кіраўніцтвам студэнта фізмата таварыша **Рабога.**

***

3 студзеня прафком БДУ арганізуе **калектыўны паход у ТРАМ** на пастаноўку **«Арыстакраты».**

10 студзеня 1937 года таксама адбудзецца калектыўны паход на пастаноўку **«Дон Жуан».**

***

Заканчваюцца курсы інструктароў ПВХО ў колькасці 195 чалавек. Курсы будуць выпушчаны да зімовых канікул.

***

У БДУ арганізован **гурток паляўнічых,** які састаіць з студэнтаў і навуковых работнікаў.

***

Спецыяльная камісія праводзіць адбор студэнтаў для **скораснага лыжнага прабегу Менск — Масква** ў часе зімовых канікул. Удзельнікі прабегу будуць нанярэдне пасланы ў дом адпачынку для трэніроўкі.

***

На імя нашага універсітэта атрымана **пісьмо і 15 фотаздымкаў ад камісарыята прапаганды рэспубліканскай Каталоніі (Іспанія).**

Прафком арганізуе спецыяльную выстаўку, дзе будзе змешчана пісьмо і фотаздымкі, якія ілюструюць жыццё і барацьбу гераічнай Іспаніі.

Выстаўка будзе ў Біякорпусе на III паверсе.

На гістфаку адбылася ўжо **здача залікаў на II і III курсах** па гісторыі старажытнага Ўсходу і ленінізму.

Вынікі здачы наступныя: **Выдатна — 35,3 проц., здавальняючы — 62,1, нездавальняючы — 2,6 проц.**

***

21 снежня закончыліся агульнагарадскія **валейбольныя спаборніцтвы** паміж камандамі вышэйшых навучальных устаноў.

Першае месца заняў калектыў БДУ (з трох каманд).

2-я мужчынская каманда ва ўсіх сустрэчах вышла без ніводнага паражэння (капітан каманды — **Вараб'ёў** — студэнт фізмата).

3 жанчын добра ігралі **Палойка, Міскевіч** (біяфак) і **Барысевіч** (фізмат). Увесь склад каманд прадстаўлен у НКА для прэміравання.

***

27 снежня па геафаку адбыўся **даклад прафесара Ленінградскага універсітэта Гладцына** па тэму: «Самастойная работа пад кнігай».

Па слядах нашых выступленняў

У газеце за «Ленінскія кадры» № 15 была змешчана заметка, у якой паведамлялася, што імпартная МАШЫНА ЛІНДЭ доўгі час стаіць без скарыстання і псуецца.

Як паведаміў нам рэктар БДУ цяпер у фізічным корпусе вядуцца работы па ўстанаўленню машыны Ліндэ, якая будзе занова ўстаноўлена не пазней 10 СТУДЗЕНЯ 1937 года.

Менск, друкарня «Звязды». Тыраж 1.000 экз. Горліт № 2549. Адказны рэдактар С. ОДЗІНЕЦ.